www.xtrapapers.com

M14/1/AXBEL/SP1/BEL/TZ0/XX

22140019

International Baccalaureate®
Baccalauréat International
Bachillerato Internacional

**BELARUSIAN A: LITERATURE – STANDARD LEVEL – PAPER 1**
**BIÉLORUSSE A : LITTÉRATURE – NIVEAU MOYEN – ÉPREUVE 1**
**BIELORRUSO A: LITERATURA – NIVEL MEDIO – PRUEBA 1**

Friday 9 May 2014 (morning)
Vendredi 9 mai 2014 (matin)
Viernes 9 de mayo de 2014 (mañana)

1 hour 30 minutes / 1 heure 30 minutes / 1 hora 30 minutos

---

INSTRUCTIONS TO CANDIDATES

- Do not open this examination paper until instructed to do so.
- Write a guided literary analysis on one passage only. In your answer you must address both of the guiding questions provided.
- The maximum mark for this examination paper is *[20 marks]*.

INSTRUCTIONS DESTINÉES AUX CANDIDATS

- N'ouvrez pas cette épreuve avant d'y être autorisé(e).
- Rédigez une analyse littéraire dirigée d'un seul des passages. Les deux questions d'orientation fournies doivent être traitées dans votre réponse.
- Le nombre maximum de points pour cette épreuve d'examen est *[20 points]*.

INSTRUCCIONES PARA LOS ALUMNOS

- No abra esta prueba hasta que se lo autoricen.
- Escriba un análisis literario guiado sobre un solo pasaje. Debe abordar las dos preguntas de orientación en su respuesta.
- La puntuación máxima para esta prueba de examen es *[20 puntos]*.


© International Baccalaureate Organization 2014

www.xtrapapers.com



*Напішыце літаратурны аналіз толькі* ***аднаго*** *з двух дадзеных тэкстаў. У сваім аналізе Вы мусіце адказаць на абодва накіравальныя пытанні.*

**1.**

**Матылёк**

Б'ецца, ўецца шпаркі, лёгкі
Сінякрылы матылёк.
*Максім Багдановіч*

Лілею
мляжвы
плёс
люляе,
З-пад злежаных
аблок
здалёк
Ляціць віхлясты і бялявы,
Пялёстак лёгкі —
матылёк.

Ён кліча у блакіт лілею,
Каб не любіла
больш
да слёз
Бліскучы ад лускі і глею,
Самлелы,
абмялелы
плёс,

Дзе лашчыць цёплай ласкай хваля
Лінёў — злянелых цельпукоў,
Паблісквае
няблізка
далеч,
Дзе ў іле
не злічыць малькоў,

www.xtrapapers.com



Дзе глыб
угнеўнена шыпела,
Калі
на хвалі
лівень
лёг...
Засумавалы,
белы,
белы
Ляціць удалеч
матылёк...

Рыгор Барадулін, *Нагбом* (1963)

(a) Патлумачце, якую ролю адыгрывае кантраст у перадачы галоўных ідэяў верша.

(б) Апішыце, якія стылістычныя сродкі, ужытыя паэтам, спрыяюць меладычнаму гучанню верша.

www.xtrapapers.com



**2.**

**Сабачча служба**

Чуў я (а мо і вы чулі) не раз, як іншыя кажуць: «Паганая тая служба — сабачча служба». Чуў — і думаў сабе: што за такая служба? Сабацы — пэўне, што і сабачча служба, а і то не паганая, бо і сабака найлепшы прыяцель чалавека і найвярнейшы з яго служака гаспадара. Але каб службу чалавека назваць паганай, сабачай — ніколі неяк не мог я даць веры. Можа быць служба цяжкая, вельмі цяжкая, але не паганая, бо ніякая праца не ганьбіць чалавека.

Але неяк давялося мне раз быць у горадзе. Заначаваў у кума. Раніцай выйшлі на вуліцу, стаім каля брамы, гамонім… Ажно ляціць колькі падросткаў, адзін і сталы лынды распусціў, за імі дзеці — і ўсе цюкаюць, свішчуць! Дзе каторы спанатрыць якога беднага сабаку, то так уляжа за ім, што толькі пяты міргацяць… Гляджу, вочы вылупіўшы, дый нічога не разумею! Ажно бачу, сунецца воз — не воз, катух — не катух, быццам велізарная жалезная клетка; на клетцы гэтай сядзіць дзяцюк — коніка паганяе, двух абапал падросткаў таксама прычапілася на гэтай клетцы з вялікімі, як вуды, пугамі, а ў клетцы гэтай сабакі сядзяць — мусіць, з дзесятак які — і малых, і вялікіх — усялякай масці, дый ззаду клеткі бяжыць яшчэ адзін невялікі кудлаты сабака.

— Што гэта, братка? — пытаю кума.

— Гіцлі, — кажа, — што ловяць валацугаў — сабак, а гэта грамада, што паперадзе з крыкам ляцела — от, людзі як людзі — заўсягды нешта добрае ў сэрцы сядзіць, дык і разганяюць сабак, каб не папаліся ў гіцлевы лапы.

— А гэты ж — задні, — пытаю, — чаму на свабодзе?

— Эгэ, — кажа кум, — ён самы важнейшы ў гіцляў: гэта правакатар. Бяжыць ён, значыцца, па вуліцы дый знаёмства заводзіць з сваім братам: угледзіць каторага, зараз да яго — з аднаго боку зайдзе — нюх, з другога — нюх, хвосцікам на ўсе бакі віль-віль, а той ужо і рад новаму сваяку — і язык высалупіць. Тут і тыц і гіцлі на новага сябра з гэтымі пугамі дый у жалезную клетачку!.. А той кудлаты юда — як бы і нічога: хвост толькі зноў крапчэй падцісне, морду ўніз апусціць дый ізноў бяжыць далей, насцеражыўшы вушы, лыпаючы з-пад лоба вачмі, шукаць новай ахвяры…

Ну, браткі, вось гэта служба дык служба: праўда, што паганая, мусіць, мала і сабак знойдзецца на такую службу!

Ядвігін Ш, *Бярозка* (1912)

(а) Напачатку аповеда аўтар задаецца пытаннем, якую службу можна назваць “паганай, сабачай”. Патлумачце, як выраз “сабачая служба” ўжываецца для пабудовы алегарычнага малюнка здрадніка.

(б) Якія стылістычныя прыёмы, ужытыя аўтарам, спрыяюць стварэнню жывой, дынамічнай карціны падзеяў?